БАГДАНОВІЧ І.І. ЭТАПЫ СТАНАЎЛЕННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX – 60-Х ГАДАХ XX СТ.

ЗБ. Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці (Да 90-годдзя ўтварэння БССР): матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 27 лютага 2009г. У 2-х ч. Ч. 2. Гісторыя беларускай дзяржавы (1919 – пачатак XXI ст.) / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М.Танка : рэдкал. А.І. Андарала, М.М. Забаўскі, А.М. Люты і інш.;А.П. Жытко (навук.рэд.). – Мінск: БДПУ, 2009. – С. 33 - 36.

**Ключавыя словы**: Нацыянальная сістэма, гістарычная адукацыя, этапы станаўлення, гісторыя Беларусі, інтэлігенцыя, вучэбны дапаможнік, стваральнік, методыка выкладання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Праблема станаўлення і развіцця нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі ў Беларусі адносіцца да адной з найменш вывучаных у айчыннай гістарыяграфіі, нягледзячы на яе важнасць і актуальнасць. Толькі ў апошнія гады паявіліся асобныя навуковыя публікацыі прысвечаныя ёй [1]. Яны ў асноўным разглядаюць развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў 90-я гады XXст. Папярэдні перыяд развіцця школьнай гістарычнай адукацыі у іх не закранаецца. У сувязі з гэтым прадстаўляецца неабхоным вызначыць асноўныя этапы станаўлення нацыянальнай гістарычнай адукацыі з моманту яе зараджэння і да 60-х гадоў XX ст.

На нашу думку час зараджэння нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі адносіцца да сярэдзіны X1X – пачатку XX стагоддзя, калі пачалося сістэматычнае навуковае вывучэнне гісторыі Беларусі. Каля яго вытокаў стаялі вядомыя беларускія этнографы, краязнаўцы, гісторыкі К. Нарбут, П. Шпілеўскі, А. Кіркор, М. Нікіфароўскі, Е. Раманаў, Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, М. Любаўскі і інш. Менавіта іх даследаванні, шырокае знаёмства з іх вынікамі новага пакалення беларускай інтэлігенцыі стварыла перадумовы для

фарміравання нацыянальнай самасвядомасці і ажыццяўлення спробы стварэння нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі.

Пачынальнікам нацыянальнай гістарычнай адукацыі па праву можна лічыць выдатнага вучонага В.Ластоўскага. Іменна ён стварыў і выдаў спачатку ў газеце "Наша ніва", а затым асобным выданнем "Кароткую гісторыю Беларусі"[2]. Гэта быў першы сістэматычны нарыс гісторыі Беларусі створаны, па словах А.Грыцкевіча "беларусам і для беларусаў"[3]. У ім упершыню з нацыянальных пазіцый была выкладзена гісторыя Бацькаўшчыны. В.Ластоўскі паспрабаваў давесці да чытача, што беларускі народ мае сваю шматвяковую і багатую гісторыю, якую трэба ведаць і якою можна ганарыцца.

Абвінавачванні В.Ластоўскага ў суб'ектывізме, у тэндэнцыйным падборы фактычнага матэрыяла, якія гучалі і зараз гучаць у яго адрас, на наш погляд, не маюць пад сабой ніякіх падстаў. Ён грунтаваўся на тых гістарычных даследаваннях, якія існавалі ў тагачаснай рускай, польскай і ўкраінскай гістарыяграфіі. Заслугай яго з'яўляецца тое, што першым у айчыннай гістарычнай навуцы ён адабраў з гістарычнага мінулага беларускага народа асноўныя факты, сістэматызаваў іх і стварыў першую вучэбнаую кнігу па гісторыі Беларусі, паказаўшы адметнасць гістарычнага шляху пройдзенага беларускім народам са старажытных часоў да пачатку XX ст.

Сучаснаму чытачу гэтага навукова-папулярнага выдання кідаюцца ў вочы асобныя недакладнасці і некаторыя фактычныя памылкі, але ўсё гэта не змяншае гістарычнай значнасці працы В. Ластоўскага. Найважнейшай яго заслугай з'яўляецца паказ тагачаснаму грамадству, што шматвяковая гістарычная спадчына беларускага народа хаваецца за нерасшыфраванымі тады тэрмінамі "рускі", "літоўскі", "ліцвінскі", што гэта тэрміналагічная заблытанасць уводзіць у зман не толькі людзей недасведчаных, але і многіх гісторыкаў, што гэта заблытанасць свядома выкарыстоўвалася, каб прынізіць нацыянальную гісторыю беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Менавіта гэта кніжка стала першым вучэбным дапаможнікам па гісторыі Беларусі. Аўтар змяшчае ў ёй больш за 40 малюнкаў, партрэтаў і фатаграфій, якія суправаджаюцца аўтарскімі паясненнямі. У прадмове ён піша:"Працу гэту ахвярую сынам маладой Беларусі, каб хаця б з гэтай кароткай і няпоўнай працы маглі пазнаваць гісторыю Бацькаўшчыны ў сваёй роднай мове"[2, с .5.]. Такім чынам у 1910 годзе паявіўся першы вучэбны дапаможнік па гісторыі Беларусі. Ён пачаў выкарыстоўвацца ў паўлегальных беларускіх школах, якія нягледзячы на ўладныя забароны існавалі ў той час на беларускіх землях. Больш менш шырокае выкарыстанне ў школьным выкладанні гісторыі ён атрымаў у гады першай сусветнай вайны, калі на акупіраванй немцамі тэрыторыі Беларусі з дазволу акупацыйных улад былі адчынены беларускія школы.

Прадаўжальнікам справы В. Ластоўскага ў галіне стварэння нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі стаў вядомы беларускі гісторык і патрыёт У.М. Ігнатоўскі. У пачатку 1915 года ён пераехаў з Вільні, дзе працаваў ў гімназіі настаўнікам гісторыі, у Мінск і ўладкаваўся на працу прафесарам Мінскага настаўніцкага інстытута. З восені 1915 года пачаў выкладаць спецкурс па гісторыі Беларусі. Змест гэтага спецкурса стаў асновай шырока вядомай яго працы "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі"[4]. Да 1926 года гэты вучэбны дапаможнік вытрымаў пяць выданняў, якія што раз дапаўняліся аўтарам. У гэтай працы даецца марксісцкая інтэрпрэтацыя гісторыі беларускага народа.

Такім чынам завяршыўся першы этап, які мохна характарызаваць як станаўленне асноў нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі. Ён пачаўся ў дарэвалюцыйны час, калі былі выдадзены першыя вучэбныя дапаможнікі па айчыннай гісторыі і зроблены першыя практычныя крокі па іх выкарыстанню ў навучанні гісторыі.

Другі этап ў станаўленні гістарычнай адукацыі ў Беларусі, на нашу думку пачынаецца ў 20-я гады XXст., калі пачала стварацца беларуская нацыянальнай школа і ажыццяўляцца ўсебаковая беларусізацыя грамадства. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

20-я гады гісторыя Беларусі як самастойны прадмет ў школе не выкладалася, бо савецкая школа адмовілася ад прадметнага навучання і класна-урочнай сістэмы навучання. У адпаведнасці з комплекснымі прагамамі ў школе навучанне вялося шляхам вывучэння прыродна-жыццёвых комплексаў, у межах якіх вучні знаёміліся з гісторыяй вывучаемай з’явы. Яно ажыццяўлялася на аснове шырокага выкарыстання метада праектаў. Падрыхтоўка праектаў па гісторыі была звязана з вывучэннем і даследаваннем гісторыі роднага краю па гістарычных крыніцах, апытаннях сведкаў гістарычных падзей, выніках краязнаўчых экскурсій і экспедыцый, апісаннях помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры. Таму 20-я гады сталі часам росквіту гістарычнага краязнаўства, у аснове якога ляжала даследаванне гісторыі роднага краю.

У сярэдзіне 20-х гадоў ў Беларусі ўзнікла і дзейнічала больш за 300 краязнаўчых таварыстваў, выдаваўся краязнаўчы часопіс “Наш край”, які не толькі друкаваў вынікі даследаванняў краязнаўцаў, але і змяшчаў метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі краязнаўчай работы ў школе. У пачатку 30-х гадоў у сувязі з пачаўшыміся рэпрэсіямі і барацьбой з нацдэмаўшчынай дзейнасць большасці таварыстваў была згорнута, перастаў выходзіць і часопіс “Наш край”, што значна абмежавала магчымасці знаёмства школьнікаў з гісторыяй Беларусі.

Значны ўклад у развіццё нацыянальнай гістарычнай навукі і гістарычнай адукацыі ў 20-я гады ўнёс выдатны беларускі гісторык М. Доўнар-Запольскі, які вярнуўся з Кіева на радзіму і пачаў працаваць прафесарам БДУ. Ён падрыхтаваў да выдання вялікую абагульняючую працу “Гісторыя Беларусі”[5], якая ўяўляла сабой сістэматычнае ізлажэнне гісторыі беларускага народа са старажытнейшых часоў да 20-х гадоў XX стагоддзя, аднак ў сувязі з пачаўшайся барацьбой з нацдэмаўшчынай, яна так і не пабачыла свет, рукапіс быў арыштаваны. Так завяршыўся другі этап станаўлення нацыянальнай гістарычнай адукацыі, які характарызаваўся імклівым ростам цікавасці да гісторыі Бацькаўшчыны і ўсебаковым яе даследаваннем і вывучэннем як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

навукоўцамі так і шырокай грамадкасцю праз шырокі ўдзел у краязнаўчым руху.

Трэці этап станаўлення нацыянальнай сістэмы школьнай гістарычнай адукацыі пачынаецца ў пачатку 30-х гадоў і працягваецца да сярэдзіны 50-х гадоў XXст. Гэта час, калі работа па стварэнню нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі, якая ішла з пачатку XX ст. фактычна была згорнута. У пачатку 30-х гадоў у школах СССР аднаўляецца прадметнае навучанне і класна-урочная сістэма навучання. Гісторыя зноў становіцца самастойным прадметам школьнага навучання. Аднак ушкольных праграмах па гісторыі не знайшлося месца для гісторыі Беларусі і нават урокам гістарычнага краязнаўства. Знаёмства з айчыннай гісторыяй стала магчымым толькі ў пазакласнай гісторыка-краязнаўчай рабоце, якую ў гэты час абмяжавалі вывучэннем рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый савецкага народа.

Пасля Вялікай Айчыннавй вайны у праграмах па гісторыі паяўляюцца спецыяльныя краязнаўчыя ўрокі, што стварыла настаўнікам гісторыі магчымасці для паведамлення вучням некаторых звестак з гісторыі роднага краю і гісторыі Беларусі ў цэлым. Вывучэнне кожнага раздзела, як правіла, павінна было завяршацца краязнаўчым урокам.

Пераломным момантам станаўлення і развіцця нацыянальнай школьнай гістарычнай адукацыі стаў XX з’езд КПСС і наступленне перыяду “хрушчоўскай адлігі”. Па рашэнню савецкага ўрада з 1958 года ў школах уводзілася вывучэнне гісторыі саюзнай рэспублікі. Саюзным рэспублікам давалася права самім вызначаць, якім чынам арганізаваць гэта вывучэнне. Такое рашэнне давала значныя магчымасці для вывучэння нацыяльнай гісторыі, стварэння падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для школ.

Упершыню ў гісторыі Беларусі ўзнікла магчымасць самастойна вызначыць парадак вывучэння айчыннай гісторыі і стварыць першы нацыянальны падручнік па гісторыі. Аднак скарысталіся гэтай магчымасцю не лепшым чынам. Міністэрствам асветы БССР вырашыла вывучаць гісторыю

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларусі шляхам уключэння ўрокаў і асобных пытанняў па гісторыі Беларусі ў адпаведныя раздзелы і тэмы праграмы па гісторыі СССР, а стварэнне першага падручніка па гісторыі БССР было даручана загадчыку кафедры гісторыі Беларусі БДУ прафесару Л.С. Абэцэдарскаму і дацэнтам М.П. Баранавай і Н.Г. Паўлавай.

Ужо ў 1959 годзе выйшаў падрыхтаваны гэтымі аўтарамі першы пробны варыянт падручніка, а ў 1960 – другі перапрацаваны і выпраўлены.[6] Ён быў напісаны ў адпаведнасцю з панаваўшымі ў тагачаснай савецкай гістарыяграфіі марксісцкіх пазіцый і склаўшыхся ў расійскіх дарэвалюцыйных і савецкіх гісторыкаў поглядаў на Беларусь, як Паўночна-Заходні край Расійскай імперыі. У ім практычна поўнасцю адсутнічала гісторыя беларускага народа ў часы ВКЛ, Рэчы Паспалітай  і гісторыя развіцця беларускага нацыянальнага руху. Утварэнне ВКЛ і Рэчы Паспалітай разглядаліся як захоп заходнерускіх зямель літоўскімі, а затым польскімі феадаламі, а ўключэнне беларускіх зямель ў склад Расійскай імперыі, як з’ява адназначна станоўчая для эканамічнага і культурнага развіцця беларускага народа.

Нягледзячы на канцэптуальныя хібы падручніка, ён усё ж даваў вучням ўяўленні аб некаторых фактах айчыннай гісторыі, а яго вывучэнне ў школе патэнцыяльна магло садзейнічаць фарміраванню ў школьнікаў нацыянальнай свядомасці, аднак рэалізаваць гэтыя магчымасці было вельмі складана, бо парадак вывучэння гісторыі Беларусі ў школе абраны Міністэрствам адукацыі БССР, перашкаджаў настаўнікам рэалізаваць іх у практыцы сваёй работы.

Змест гісторыі Беларусі рэкамендавалася разглядаць пры вывучэнні курса гісторыі СССР са старажытных часоў да нашых дзён у 7-10 класах. Для гэтага ў адпаведныя тэмы праграмы па гісторыі СССР было ўключана 30 асобных урокаў і  яшчэ 32 пытанні па гісторыі БССР. Пры гэтым дадатковы час на іх вывучэння не выдзеляўся. Настаўнік ставіўся перад альтэрнатывай ці скараціць час на вывучэнне курса гісторыі СССР, ці наогул не вывучаць айчынную гісторыю. Часцей выбіралася другое. Урокі па гісторыі ў лепшым выпадку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

фармальна запісваліся ў класны журнал, у горшым і гэтага не рабілася.

Разам з тым уключэнне курса айчыннай гісторыі ў праграмы сярэдняй школы, хаця і было фармальным, ўсё ж стварала патэнцыяльныя магчымасці азнаямлення школьнікаў з асноўнымі фактамі па гісторыі Беларусі, назапашванню вопыту стварэння школьных падручнікаў і распрацоўкі пытанняў методыкі яе выкладання. Яно ў значнай ступені падрыхтавала глебу для станаўлення і развіцця нацыянальнай сістэмы гістарычнай адукацыі ў 90-я гады XX ст.

Літаратура

1. Вирская, В.П. Формирование новой концепции истории Беларуси в системе средней общеобразовательной школы(1986-1990-е гг.): автореф. Дис. …канд. ист. иаук: 07.00.02 / В.П. Вирская;     Белорус.гос. пед. ун-т. – Минск, 2004.

2. Ластоўскі, В.Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. / В.Ю. Ластоўскі. – Мінск: Універсітэцкае,1992.

3. Грыцкевіч, А. Пасляслоўе (Вацлаў Ластоўскі (Власт) і яго “Кароткая гісторыя Беларусі”) / А.Грыцкевіч// Кароткая гісторыя Беларусі. – Мінск: Універсітэцкае,1992. – С. 111- 125.

4. Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У.М. Ігнатоўскі. – Мінск: Універсітэцкае,1993.

5. Доўнар-Запольскі, М.В. Гісторыя Беларусі / М.В.Доўнар-Запольскі. – Мінск: Універсітэцкае,1993.

6. Гісторыя БССР : падручнік для сярэдняй школы / Л.С. Абэцэдарскі [і інш.] пад рэд. Л.С. Абэцэдарскага. – Мінск: Народная асвета, 1960.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ